чески правильного отношения к миру природы, получив соответственно 9,6 и 10,2 баллов;

– в свою очередь, ребята младшей группы «Фантазеры» показали низкий уровень знаний экологически правильного отношения к миру природы – 8,35 баллов и ниже среднего уровня сформированность экологических знаний – 8,9 баллов.

Разработан комплекс мероприятий по повышению уровня экологической культуры дошкольников, который включает в себя:

– эколого-оздоровительную тропу «Ребенок открывает мир природы, укрепляет свое здоровье»;

– планы физкультурных занятий по сюжетам русских народных сказок « Колобок» и «Теремок»;

– игра-превращение «Найди домик животному».

Разработанный нами комплекс мероприятий по повышению уровня экологической и физкультурно-оздоровительной воспитанности дошкольников на занятиях и в повседневной жизни показал свою эффективность: уровень экологических знаний и экологически правильного отношения к миру природы, а также уровень физической подготовленности и соответственно уровень физического развития дошкольников в конце эксперимента оказался выше, чем в начале.

ЛИТЕРАТУРА

Современные аспекты ведения мониторинга состояния здоровья детей Республики Беларусь: материалы межвуз. конференции студентов, магистрантов и аспирантов. Минск 2008г./ Белорусский государственный медицинский университет, редкол.Борисова Т.Л, Матюхина Л.Н.- Минск 2008г. 3-4с.

УДК 7.072.2

## МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА: СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД

**Камісарук С. М.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У сучасных гуманітарных даследаваннях адным з найбольш значных метадалагічных падыходаў з'яўляецца сістэмная метадалогія [1]. Сістэмны падыход прадстаўляе тэарэтыка-метадалагічную аснову для вывучэння фенаменаў беларускай мастацкай культуры. Прычынай выбару сістэмнага падыходу з'яўляецца яго адпаведнасць сістэмнасці аб'екту даследавання, якім вызначаецца мастацтва, у той час, калі прадметам даследавання вылучаецца творчасць пэўнага мастака. Дадзеная метадалогія найбольш эфектыўная пры вывучэнні сістэмных



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

аб'ектаў, што ўяўляюць сабой найвышэйшыя ўзроўні арганізацыі быцця, і мастацтва Беларусі з'яўляецца менавіта такой звышскладанай сістэмай.

Адпаведна сістэмнаму падыходу творчасць пэўнага мастака вызначаецца як сістэма, спецыфічнымі падсістэмамі якой з'яўляюцца культуралагічныя, стылістычныя, жанравыя кампаненты, звязаныя пасродкам адзінага прынцыпу. Такім прынцыпам сцвярджаецца пэўны мастацкі стыль альбо накірунак. Сама ж творчая сістэма і яе кампаненты асэнсоўваюцца з пункту гледжання той ролі, якую яны адыгралі ў развіцці беларускай мастацкай культуры. У той жа час у іх увасоблена не толькі адметнасць нацыянальнай культуры, але і агульнасць яе развіцця ў еўрапейскім кантэксце. Таму дадзеная творчая сістэма разглядаецца як частка метасістэмы беларускай і еўрапейскай культуры, якая займае пэўнае месца ў гісторыі.

Сістэмны падыход патрабуе трохбаковага разгляду прадмета даследавання, а менавіта творчасці мастака: гістарычнага, прадметнага, функцыянальнага.

1. Гістарычны аспект сістэмнага падыходу выкарыстоўваецца для вывучэння фарміравання творчай сістэмы мастака. Яна разглядаецца як сістэма адкрытага тыпу, якая валодае свабодным выбарам напрамкаў развіцця, вызначае меру кіравання альбо змены складзенай праграмы. Пры гэтым яе фарміраванне абумоўлена дзвюмя групамі фактараў, цесна звязаных паміж сабой: унутранай логікай самаразвіцця і знешнімі ўплывамі гісторыка-культурнага асяроддзя.

Унутраныя фактары фарміравання творчай сістэмы мастака звязаны, найперш, з яго асабістым лёсам. Знешнімі фактарамі з'яўляюцца дзяржаўныя, палітычныя, саслоўныя, канфесійныя асаблівасці развіцця беларускай гісторыі і культуры. Ім належыць вызначальная роля ў станаўленні нацыянальнай адметнасці беларускага мастацтва. Менавіта гэтыя фактары пакладзены ў аснову вылучэння асобных перыядаў мастацкага працэсу [2].

2. Прадметны аспект сістэмнага падыходу дазваляе вылучыць кампаненты ці падсістэмы творчай сістэмы мастака, а таксама зацвердзіць пэўны мастацкі стыль як сістэмаўтваральны прынцып іх узаемасувязі. Сістэмны падыход зыходзіць з разумення творчасці як цэласнасці, што не зводзіцца да складаючых яе частак. Вызначыць кампаненты творчай сістэмы магчыма толькі рухаючыся ад разгляду цэлага да выяўлення іх месца і функцый, якія абумоўлены адносінамі кожнага кампанента да цэлага і адзін да другога.

Прадметны аспект уключае кампанентны і структурны аналіз творчасці мастака. У кампанентным аналізе вылучаюцца



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

культуралагічныя, стылістычныя, жанравыя кампаненты, якія ўтвараюць цэласнасць творчай сістэмы. У структурным аналізе сістэмаўтваральным прынцыпам цэласнасці, унутранай упарадкаванасці і ўзаемазвязанасці кампанентаў сцвярджаецца пэўны мастацкі стыль.

3. Функцыянальны аспект сістэмнага падыходу накіраваны на вывучэнне творчасці мастака як падсістэмы ў метасістэме беларускай і еўрапейскай мастацкай культуры, што абумоўлівае яе ўнутранае і знешняе функцыянаванне.

Унутранае функцыянаванне творчасці мастака ажыццяўляецца як сінтэзаванне на аснове пэўнага мастацкага стылю розных сфер культуры – гісторыі, ідэалогіі, мастацтва. Характар унутранага функцыянавання дадзенай сістэмы абумоўлены, з аднаго боку, яе структурай, з другога – яе знешняй функцыяй. Знешняя функцыя – гэта тая роля, якую творчасць мастака адыграла ў гісторыі мастацтва. Знешняе функцыянаванне творчасці пэўнага мастака ажыццяўляецца ў працэсе яе размежавання з іншымі творчымі падыходамі. Беларускае мастацтва ніколі не развівалася ізалявана, яно сутыкалася з рознымі нацыянальнымі школамі, ведала ўплывы замежных майстроў [3]. Цесныя культурный сувязі, якія складваліся на працягу стагоддзяў гістарычнага развіцця беларускіх земляў, робяць складаным пытанне аб прыналежнасці пэўнага мастака да культуры асобнай нацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Каган, М. С. Философия культуры / М. С.Каган. – С.-Пб.: "Петрополис", 1996. – 416 с.
2. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва. У 2 т. Т. II. XVIII – пачатак XXI ст. / Б. А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2007. – С. 157–160.
3. Dobrowolski, T. Nowoczesne malarstwo polskie: w 3 t. / T.Dobrowolski. – Wrocław-Kraków: Zakład narodowy im. Ossolińskich, 1957-1964. – Т. 1. – 1957. – 460 s.; Т. 2. – 1960. – 452 s.; Т. 3. – 1964. – 504 s.

УДК 101.1:316

## СОВРЕМЕННОЕ ОБЩЕСТВО КАК ОБЩЕСТВО РИСКА

**Малиновская Т. И.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Современное общество сталкивается со сложными экологическими, демографическими и ресурсными проблемами. Угроза ядерной войны, радиоактивного заражения, наличие вредных и ядовитых веществ в природе, воздухе, продуктах питания – всё это побочный ре-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ